Однако, несмотря на большое количество работ, посвящённых изучению фаунистической лексики, данный языковой пласт требует более подробного рассмотрения с позиций концептуальной деривации (когнитивной лингвистики). Новый взгляд на проблему формирования переносных значений зоонимов заключается в рассмотрении не только фаунистической метафоры, но и в выявлении метонимических моделей, когнитивных механизмов, позволяющих установить основания метафорических и метонимических переносов, а также в выделении и описании концептуальных областей, относительно которых происходит осмысление зоонимов в переносных значениях.

## БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЕ ССЫЛКИ


1. Большая российская энциклопедия // https://bigenc.ru/ [Электронный ресурс]. – 2018. Режим доступа : https://bigenc.ru/biology/text/4706804. – Дата доступа : 20.01.2018.
2. Григоренко, Н.А. Лексика флоры и фауны в говоре камчадалов :автореф. дис. ... канд.филол. наук : 10.02.01 / Н. А. Григоренко ; ГОУ ВПО «Ярославский государственный педагогический университет им. К.Д. Ушинского». – Ярославль, 2007. – 22 с.
3. Солнцева, Н.В. Сопоставительный анализ зоонимов русского, французского и немецкого языков в этносемантическом аспекте: автореф. дис. ... канд.филол. наук: 10.02.20 / Н.В. Солнцева. – Омск, 2004. – 32 с.


# КАНЦЭПТЫ «АНТРАПАЛАГІЧНАГА МЕСЦА» І ПАЗАМЕСЦА» Ў ПОСТМАДЭРНІСЦКАЙ АНТРАПАЛОГІІ

# ANTHROPOLOGICAL PLACE AND NON-PLACE CONCEPTS IN POSTMODERN ANTHROPOLOGY


***І.В. Поўх***

***I.V. Powkh***

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна,
Брэст, Беларусь, *iryna_powkh@tut.by*
Brest State A.S. Pushkin University,
Brest, Belarus, *iryna_powkh@tut.by*



Артыкул прысвечаны праблеме ўвасаблення катэгорыі прасторы ў заходнееўрапейскай антрапалогіі эпохі постмадэрнізму. Сярод асноўных складнікаў канцэптасферы заходнееўрапейскай постмадэрнісцкай прасторы аўтар вылучае канцэпты “фрагментацыя”, “прасторавая дэзарыентацыя”, “гіперпрастора”, “антрапалагічнае месца” і “пазамесца”. Прааналізаваны асноўныя фармальныя прыкметы “антрапалагічнага месца” як месца ідэнтычнасці, стасункаў і гісторыі і “пазамесца” як адмаўленне месца, дынамічнай прасторы, пазбаўленай уласнага наймення.



*Ключавыя словы*: антрапалогія; постмадэрнізм; прастора; антрапалагічнае месца; пазамесца.

The article discusses the main manifestations of space as a category of postmodern Western European anthropology. The author lists the main constituents of the said category's conceptual framework, which encompasses the concepts of fragmentation, spatial disorientation, hyperspace, anthropological space and non-space. The discussion presents a formal analysis of the anthropological space concept as the space of identity, relations and history, while non-space is shown as denial of place, a dynamic space devoid of the name of its own.

*Keywords:* anthropology; postmodernism; space; anthropological place; non-place.

Адной з праяў постмадэрнізму, як сцвярджаюць навукоўцы [1], было рэзкае павелічэнне тэмпаў развіцця інфармацыйных тэхналогій, вынікам чаго стала рэарганізацыя і глабалізацыя эканомікі, якая, у сваю чаргу, мела значны ўплыў на сацыякультурную структуру заходняга грамадства, выклікала змену жыццёвага ладу, а таксама суб'ектыўнага ўспрымання часу і прасторы. Сярод адметных уласцівасцяў постмадэрнізму вызначаюцца т. зв. "фрагментацыя" і "прасторавая дэзарыентацыя" [1, с. 3], пачуццё заклапочанасці і адарванасці, згубленая самаідэнтыфікацыя з пэўным месцам і супольнасцю.

Культура масавага спажывання – як натуральны вынік тэхналагізацыі грамадскага жыцця – адмоўна ўплывае на чалавека як асобу, сацыяльныя ўзаемасувязі і навакольнае асяроддзе, вядзе да страты аўтэнтычнасці, калі падзел паміж сапраўдным і ілюзорным сціраецца пад уздзеяннем падабенстваў і імітацый, ствараючы т. зв. "гіперпрастору" [2; 3], якая выходзіць за межы ўпарадкаванасці і класіфікацыі. Адпаведна, глабалізацыя і дынамізацыя ўсіх сацыякультурных працэсаў, якія больш не вызначаюцца прыналежнасцю да пэўнай мясцовасці, рэгіёну ці тэрыторыі, азначае пераход ад прасторы да струмянёў ("стрымаў"), ад іерархічных структур да дэзарганізацыі. Постмадэрнісцкая прастора, такім чынам, інтэрпрэтуецца даследчыкамі як новая канцэпцыя не самой прасторы, а шляхоў яе запаўнення і, адпаведна, вызначаецца фрагментарнасцю і неўпарадкаванасцю элементаў, якія праз яе праходзяць, выступаючы своеасаблівым фонам, на якім можа адбівацца любая выява, рэфлексіўнай асновай, якая паядноўвае разнастайныя і разнапланавыя культурныя – у тым ліку, фальклорныя – праявы.

У другой палове XX стагоддзя на змену мадэрнісцкаму супрацьпастаўленню цэнтру і перыферыі прыходзіць сімбіятычнае супастаўленне глабальнага і лакальнага. Географ і антраполаг Дэвід Харві [4] звяртаецца да прынцыпаў класіфікацыі прасторы, распрацаваных французскім філосафам і сацыёлагам Анры Лефеўрам (*Henri Lefebvre*), і паядноўвае іх з трыма ключавымі канцэптамі,

прапанаванымі Карлам Марксам (кошт, спажывецкі кошт, абменны кошт). Анры Лефевр вылучае тры асноўныя тыпы стаўлення да прасторы: прасторавы досвед (матэрыяльны), канцэптуалізаваная прастора (формы і спосабы яе ўвасаблення) і перажытая прастора (сэнсы, пачуцці і эмоцыі). Адпаведна, Дэвід Харві змяшчае спажывецкі кошт у сферу абсалютнай прасторы і абсалютнага часу. Абменны кошт апісвае стасункі, рух тавараў, сродкаў і людзей у межах адноснай прасторы і адноснага часу. Працэс абмену бесперастанна зрушвае каардынаты прасторы і часу, тады як з’яўленне грашовых сродкаў як меры кошту паскарае гэты рух у рэляцыйнай прасторы і часе.

У 1995 годзе французскі антраполаг Марк Ажэ (*Marc Augé*) распрацоўвае канцэпты “антрапалагічнага месца” і постмадэрнісцкага “пазамесца” (*non-place*) [5]. Першы з іх даследчык вызначае як канкрэтную і сімвалічную прасторавую канструкцыю, якая сама па сабе не спрыяе ўзнікненню перыпетый і супярэчнасцяў грамадскага жыцця, але стварае кантэкст, у якім усяму надаецца сваё месца. Сцвярджаючы неадназначнасць статусу антрапалагічнага месца як абстрактнага канцэпта, М. Ажэ апісвае яго як часткова матэрыялізаванае альбо міфалагізаванае ўяўленне людзей, якія насяляюць адпаведную прастору, пра іх сувязь са сваёй тэрыторыяй, сям’ёй і г.д., сфарміраванае ў залежнасці ад асабістага пункту гледжання індывіда і яго месца ў сацыяльнай структуры ўласнай супольнасці.

Паводле М. Ажэ, антрапалагічнае месца ўяўляе сабой сэнсавую перадумову для тых, хто яго насяляе, і перадумову зразумеласці для староннягa назіральніка. Пры ўсёй сваёй разнастайнасці, антрапалагічныя месцы маюць не менш за тры агульныя ўласцівасці: гэта месцы ідэнтычнасці, стасункаў і гісторыі. Арганізацыя хатняй прасторы, правілы, якімі кіруюцца ўсе жыхары, раянаванне населенага пункта, месцазнаходжанне алтара, упарадкаванне месцаў агульнага карыстання, размеркаванне зямельных надзелаў адпавядаюць прасторавым і сацыяльным перспектывам, наказам і забаронам, што датычацца кожнага чалавека. Апрача таго, антрапалагічнае месца вызначаецца геаметрычна з дапамогай трох простых прасторавых чыннікаў, прыдатных для апісання любой сацыяльнай прасторы: лінія, судотык ліній і кропка судотыку, – якім у побытавым мысленні адпавядаюць шляхі і сцежкі, пракладзеныя людзьмі паміж рознымі локусамі ў межах уласнай прасторы; скрыжаванні і адкрытыя прасторавыя аб’екты (плошча, рынак і пад.), дзе людзі праходзяць, сустракаюцца ці збіраюцца з пэўнай мэтай; а таксама аб’екты манументальнага мастацтва рэлігійнага альбо палітычнага напрамку, якія ўсталёўваюць прыналежнасць адпаведнага локусу і тых, хто ў ім знаходзіцца, да

пэўнай супольнасці, надаючы ўсяму, што па-за яго межамі, статус "іншага", прыналежнага да іншых локусаў і прастор. Адзначаецца таксама, што сфера выкарыстання трох пералічаных вышэй чыннікаў не абмяжоўваецца прасторамі, якія маюць вялікае палітычнае ці эканамічнае значэнне, але распаўсюджваецца ў аднолькавай ступені на вясковую і хатнюю прасторы.

Апісанне антрапалагічнага месца як структуры, якая характарызуецца наяўнасцю ідэнтычнасці, стасункаў і гісторыі, дазваляе вызначыць катэгорыю "пазамесца" ад адваротнага – г. зн. як прастору, якой не ўласцівыя пералічаныя вышэй прыкметы. Паводле М. Ажэ, "пазамесцы" як прасторы, адрозныя ад антрапалагічных месцаў, узнікаюць ва ўмовах "звышмадэрнізму" (*supermodernity*). "Пазамесцы" не існуюць самі па сабе – унутры іх перастварающца месцы, захоўваюцца і аднаўляюцца стасункі. Адрозненне паміж месцам і "пазамесцам" грунтуецца на супрацьпастаўленні катэгорый месца і прасторы. Калі катэгорыя антрапалагічнага месца ахоплівае магчымасць падарожжа па ім, наяўнасць уласнай мовы і ўласнага дыскурсу, то катэгорыя прасторы, праз адсутнасць пэўных характарыстык, датычыцца пазбаўленай уласнай сімволікі паверхні планеты. Паняцце "прастора" можа выкарыстоўвацца ў дачыненні да тэрыторыі, адлегласці і нават часавага прамежку і мае больш абстрактны характар, чым месца, якое утрымлівае, па меншай меры, спасылку на падзею (якая мела месца), міф (які, як мяркуецца, меў месца), альбо гісторыю (якая ствараецца людзьмі, што займаюць высокае месца ў грамадстве).

Звяртаючыся да прапанаванага Мішэлем дэ Серто азначэння катэгорыі "пазамесца" як адмаўлення месца, адсутнасці ў яго ўласнага наймення, што набліжае яго да шляху як прамежкавай катэгорыі, Марк Ажэ называе архетыпам "пазамесца" прастору вандроўніка. Паводле М. Ажэ, прастора як сукупнасць месцаў вынікае з падвойнага руху: рух вандроўніка і адначасовы рух ландшафтаў, якія праходзяць паўз яго, фіксуюцца мімаходзь, застаюцца ў памяці серыяй ментальных фотаздымкаў і варыятыўна аднаўляюцца ў аповедах. Рух надае адмысловы статус тапонімам, зрушвае фокус і межы, паяднoўвае месцы і адмаўляе іх існаванне, тым самымператвараючы іх у "пазамесцы".

Канцэпт "пазамесца" ўжываецца ў дачыненні да двух узаемадапаўняльных, але самастойных аспектаў рэчаіснасці: прасторы як прамежку паміж пэўнымі канцавымі пунктамі і стасункаў індывіда і прасторы. Нягледзячы на вялікую колькасць пунктаў судотыку паміж двума прыведзенымі вышэй аспектамі, атаясамліваць іх нельга: "пазамесцы" бяруць удзел ва ўсталяванні шырокага дыяпазону стасункаў, што маюць толькі ўскоснае дачыненне да свайго асноўнага

прызначэння. У той час як антрапалагічная прастора ўяўляе сабой комплекс асабістых ідэнтычнасцяў і ствараецца моўнымі сродкамі, традыцыйнымі ведамі і практыкамі, “пазамесца” грунтуецца на ананімнай і часовай калектыўнай ідэнтычнасці пэўных сацыяльных супольнасцяў (пасажыраў, вандроўнікаў, пакупнікоў і пад.). “Пазамесца” вызваляе індывіда ад уласных дэтэрмінант, ператвараючы яго ў абстрактную сацыяльную функцыю, – страта асабістай ідэнтычнасці кампенсуецца набыццём актыўнай сацыяльнай ролі.

“Пазамесца” як прамежкавая прастора не мае ўласнай сацыяльнай супольнасці, існуе выключна ў цяперашнім часе, узнікае ў момант яе праходжання і вымяраецца часавымі адзінкамі.

Такім чынам, аналіз навуковых прац заходнееўрапейскіх даследчыкаў дазваляе вылучыць наступныя ўласцівасці “антрапалагічнага месца” як складніка канцэптасферы постмадэрнісцкай прасторы: адначасовая канкрэтнасць і абстрактнасць, сімвалічнасць, кантэкстуалізацыя, міфалагізацыя, геаметрычнае вызначэнне, наяўнасць ідэнтычнасці, стасункаў і гісторыі. Адпаведна, “пазамесца” ўяўляе собой прастору, якой не ўласцівыя пералічаныя вышэй прыкметы, і вызначаецца дынамічнасцю, прамежкавым станам, адсутнасцю ўласнага наймення і ўласнай сацыяльнай супольнасці, а таксама прыналежнасцю выключна да цяперашняга часу.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ**

1. Francese J. Narrating Postmodern Time and Space. New York : SUNY Press, 1997.
2. Anttonen P. J. Tradition through Modernity: Postmodernism and the Nation-State in Folklore Scholarship. Helsinki : Finnish Literature Society, 2005.
3. Jameson F. Postmodernism, or The Cultural Logic of Late Capitalism // New Left Review. 1984. Vol. 146.
4. Harvey D. O espaço como palavra-chave // Em Pauta. 2015. Vol. 35, № 13.
5. Augé M. Non-Places: Introduction to an Anthropology of Supermodernity. London ; New York : Verso, 1997.